***Наталля Петухова***

# РАЗВІЦЦЁ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ ПАДЛЕТКАМІ Ў ПРАЦЭСЕ ФАЛЬКОРНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

У XXI ст. праблема станаўлення асобы, адказнай за паспяховае існаванне і гарманічнае развіццё грамадства ў экалагічна ўраўнаважаным асяроддзі, з'яўляецца прадметам няспыннага педагагічнага пошуку. Узнікае патрэбнасць у фарміраванні экалагічнай свядомасці новага пакалення, што немагчыма без развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды, якое па сваім змесце выключае спажывецкае, утылітарнае стаўленне да яе. Сутнасць эстэтычнага ўспрымання прыроды заключаецца ў тым,што пры зносінах з ёй у асобы абуджаюцца такія эмоцыі, як захапленне, радасць, здзіўленне, замілаванне, спачуванне, якія вызначаюць характар мыслення і паводзін чалавека, робяць больш змястоўнымі экалагічныя веды.

Навуковыя даследаванні С.Д. Дзераба, Б.Ц. Ліхачова, Л.П. Пячко, Н.У. Самерсавай, Л.М. Чамаевай, М.В. Шаптухоўскага, В.А. Ясвіна іінш. сведчаць аб неабходнасці інтэнсіўнага развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды менавіта ў падлеткавым узросце, якому ўласціва крайняя няўстойлівасць эколага-эстэтычнай культуры. У падлеткавым узросце адбываецца рэзкі рост прагматычных матываў успрымання прыроды, якія суправаджаюцца наіўным уяўленнем, што прыгажосцю можна валодаць як нейкай матэрыяльнай каштоўнасцю і распараджацца ёю на свой погляд.Многія падлеткі праяўляюць жорсткія адносіны да жывёл і раслін,што звязана з усплёскам агрэсіўнасці, назапашанай з-за праблем псіхафізіялагічнай і сацыяльнай спеласці. Яны дэманструюць неразвітасць эстэтычнага ўспрымання прыроды, абмяжоўваючыся арыентацыяй толькі на «прыгожае – агіднае», якая адказвае бытавому ўзроўню свядомасці, вядзе да падтрымкі варварскага спажывання прыродна-прыгожага і апраўдвае знішчэнне ўсяго, што ілжыва ацэньваецца як прыродна-агіднае.

Педагагічны вопыт Г.П. Арловай, В.С Болбаса, Г.М.Волкава, Л.М. Гафаравай, С.І. Мургаевай, І.І. Ярыты і інш. сведчыць аб тым, што важным сродкам фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды з'яўляецца фальклор. Паэтычнае, моўнае багацце яго твораў выступае ў якасці эстэтычнай рэчаіснасці, якая валодае значнымі патэнцыяльнымі магчымасцямі развіцця светаўспрымання і светаразумення кожнага чалавека. Мастацкія сюжэты, паэтычныя вобразы фальклору, якія ўвасабляюць міфалагічныя ўяўленні старажытных людзей, іх назіранні за прыродай і навакольным светам, выклікаюць у асобы глыбокія эстэтычныя пачуцціі перажыванні, фарміруюць уяўленні пра хараство беларускай прыроды, пра месца чалавека ў ёй. Менавіта таму педагагічны эксперымент аўтара артыкула адбыўся ў дзіцячых фальклорных калектывах «Сунічка» Цэнтра дадтковай адукацыі дзяцей і моладзі «Кантакт» Цэнтральнага раёна г. Мінска і «Рамонак» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк» Ленінскага раёна г. Мінска.

У дзейнасціфальклорных калектываў вялікае месца адводзіцца развучванню і выкананню народных песень. Выкарыстанне народных спеваў і непарыўна звязаных з імі ў побыце гульняў, рухаў, побытавых танцаў – эфектыўны шлях далучэння падлеткаў да традыцыйнай беларускай культуры і пашырэння іх эстэтычнага вопыту і кругагляду. Для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды асабліва важна, каб падлеткі былі цалкам ахоплены прыгажосцю і велічнасцю каляндарна-абрадавай песні, адлюстраваннем хараства прыроды ў яе словах, гуках, інтанацыях. Асаблівае патрабаванне – вывучэнне каляндарна-абрадавых твораў адпаведна порам года: зімовыя песні – зімой, летнія – летам, восеньскія – восенню, веснавыя – вясной. Такіпадыход актывізуе эстэтычную думку падлеткаў, садзейнічае іх эмацыянальнаму «перанясенню» ў прыроду, праецыруе мастацкія аналогііі асацыяцыі на прыродны свет. Гэта, у сваю чаргу, патрабуе глыбокага засваення эстэтычнага зместу каляндарна-абрадавай песні, расшыфроўкіі тлумачэння незразумелых удзельнікам аматарскага фальклорнага калектыву дыялектных слоў, словазлучэнняў, вызначэння яе месца ў пэўным каляндарным абрадзе. Засваенне ладава-інтанацыйнай і метрарытмічнай будовы музычнай мовы, мнагапланавага і асацыятыўнага зместу паэтычных формул, якія адлюстроўваюць эмацыянальна-вобразны змест беларускай народнай каляндарна-абрадавай песні, дапамагае адчуць падлеткам цэласнасць, глыбіню і гармонію спачатку мастацкіх твораў фальклору, а потым і акаляючага асяроддзя.

Наяўнасць мастацка-эстэтычных ведаў, здольнасць да суперажывання, эмацыянальная спагадлівасць дазваляюць успрымаць цэласнасць, гармонію прыроднага свету ў яго мастацкім адлюстраванні, нараджаюць складаныя асацыяцыіі аналогіі, сувязі мыслення з аб'ектам пазнання. Суаднясенне мастацкага зместу з непасрэднымі жыццёвымі ўражаннямі, асабістымі назіраннямі дапамагае падлеткам адчуць эстэтычную каштоўнасць прыроды, што замацоўваецца ў эстэтычных меркаваннях.

Эстэтычныя меркаванні падлеткаў сведчаць аб ступені развіцця іх эстэтычных пачуццяў, здольнасці аднаўляць цэласны мастацкі вобраз народнай песні на падставе ўласных асацыяцый праз параўнанне са з'явамі рэчаіснасці, іншымі творамі фальклору або сумежных мастацтваў, што садзейнічае паступоваму павышэнню і ўзбагачэнню ўзроўню эстэтычнага ўспрымання не толькі фальклорных твораў, але і адлюстраваных у іх у вобразнай, мастацкай форме прыродных аб'ектаў. Паступова, абуджаючы думкіі пачуцці сваіх выхаванцаў, педагог раскрывае перад імі ўнутраныя сувязі фальклорнага мастацтва з асобнымі з'явамі прыроднага наваколля, у выніку чаго яны пачынаюць адчуваць і ўсведамляць эмацыянальны сэнс эстэтычных абагульненняў. Рацыянальнае ўсведамленне, спасціжэнне твораў фальклору дапамагае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падлеткам узнавіць у сваім уяўленні адэкватныя эстэтычныя вобразы, глыбока ўсвядоміць і засвоіць іх эстэтычны змест, што спрыяе назапашванню мноства эстэтычных уражанняў і ведаў, пашырэнню эстэтычнага вопыту, на падставе якога яны навучаюцца з агульнай масы прыродных і жыццёвых з’яў вылучаць уласна эстэтычныя і дастаткова дакладана меркаваць аб іх каштоўнасціі прыгажосці.

Аднак эстэтычны вобраз народнай песні ствараецца не толькі словам і музыкай, але і ўсім абліччам яе выканаўцы, тэмбрам яго голасу, манерай спеваў. Таму намі былі вылучаны спецыяльныя заняткі, на якіх народная песня засвойваецца як феномен вуснай традыцыі шляхам шматразовага праслухоўвання этнаграфічных запісаў і самастойнага аднаўлення песні ў адпаведнасці з фальклорным узорам, на падставе еднасці моўных (дыялектных асаблівасцей, спосабаў гукаўтварэння і артыкуляцыі) і музычных (метрарытмічных і ладава-інтанацыйных) характарыстык.Па-першае, варта дамагацца абсалютнай дакладнасці вымаўлення дыялектных асаблівасцей народнай песні не як скажэння беларускай літаратурнай мовы, а як крыніцы жывой гаворкі, якая з’яўляецца інтанацыйна базай для ўзнікнення меладычнага багацця беларускай песеннасці. Слова, прамоўленае ў дыялектнай форме, з уласцівай яму інтанацыяй становіцца асновай для фарміравання спеўнай пазіцыі. Пры гэтым базай для максімальна дакладнага прайгравання фанетычных асаблівасцейз’яўляюцца казкі, скорагаворкі, лічылкі, дражнілкііінш. Па-другое, важна вывучаць музычна-стылявыя заканамернасці, уласцівыя пэўнаму рэгіёну. Рэгіянальны характар маюць тэмбравыя характарыстыкі гуку, ладавыя асаблівасці, поліртмія музычнай тканіны, розныя спецыфічныя выканальніцкія прыёмы (вібрата, мелізмы, глісанда іінш.), асаблівасці харэаграфіі і г.д. Варыянты аднаго і таго ж напеву, запісаныя ў розных вёсках, могуць даць уяўленне пра яго тыповыя заканамернасці, пры гэтым кожны варыянт захоўвае сваю каштоўнасць і ўнікальнасць. Праслухоўванне і аналіз усіх магчымых варыянтаў узбагачае слыхавы досвед удзельнікаў фальклорных калектываў і дазваляе паспяхова выкарыстоўваць яго на практыцы. Спалучаючы шматразовае слуханне этнаграфічнага выканання народнай песні са спробамі ўласнага капіравання, падлеткі захоўваюць моўныя інтанацыі, інтуітыўна шукаюць свае варыянты ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй, жыццёвым кантэкстам. Такі спосаб навучання народным спевам садзейнічае далучэнню падлеткаў да творчасці на аснове мясцовых традыцый, пашырае іх уяўленні аб народнай музычна-паэтычнай мове, дазваляе ім адчуць і ўвасобіць у сваім выкананні атмасферу бытавання фальклору, што спрыяе найбольшаму іх пагружэнню ў фальклорную культуру, узбагачае эмацыянальны свет, выхоўвае любоў да роднага краю.

Вялікае значэнне для эксперыментальнай работы мела наведванне Рэспубліканскіх этнаграфічных канцэртаў «Фальклор беларускай глыбінкі» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, знаёмства ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў з творчасцю аўтэнтычных выканаўцаў твораў народнага мастацтва (песень, танцаў, казак, карагодаў, інструментальнай музыкі). Арганізуючы гэту работу, мы зыходзілі з даўно вядомых сведчанняў збіральнікаў фальклору аб тым, што паўнавартаснае эстэтычнае ўздзеянне фальклорны твор аказвае толькі падчас яго «жывога» аўтэнтычнага выканання і непасрэднага ўспрымання ад носьбітаў. Незвычайная прыгажосць фальклорных твораў, узмоцненая натуральнасцю трансляцыі, усведамленне сваёй роднасці з тымі, хто некалі жыў і выконваў гэтыя творы, аказвала незабыўнае ўражанне на падлеткаў, адкрывала новыя эмоцыі, асацыяцыі, гарманічныя структуры, драматургічныя камбінацыіі г.д. Непасрэднае ўспрыманне ўдзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў «жывога» выканання паглыбіла іх жыццёвы і эстэтычны вопыт, садзейнічала павышэнню інтарэса да ўспрымання фальклоных твораў і ўдасканаленню выканальніцкага майстэрства, а непасрэдныя стасункі з носьбітамі фальклору ўзбагацілі жыццё калектываў, спрыялі выхаванню павагі да людзей, якія жывуць побач, абудзілі жаданне берагчы і працягваць мастацкія традыцыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ